# ФАРМІРАВАННЕ ПРАВАВОЙ КУЛЬТУРЫ ПАДЛЕТКАЎ У КАНТЭКСЦЕ СУЧАСНЫХ ТЭНДЭНЦЫЙ БІБЛІЯТЭЧНАГА АБСЛУГОЎВАННЯ

**Чупракова І. А.**
*аспірантка кафедры менеджмента інфармацыйна-дакументнай сферы*
*УА «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»,*
*загадчык сектара даведачна-аналітычнай работы і інфармацыйных рэсурсаў*
*Нацыянальнага цэнтра правовой інфармацыі Рэспублікі Беларусь*

У сучасных сацыяполікультурных умовах адзначаецца павышэнне статусу бібліятэкі як фундаментальнага рэсурсу духоўнага здароў’я грамадства, сацыяльнай стабільнасці, эканамічнага росту і нацыянальнай бяспекі на аснове яе канструктыўнага супрацоўніцтва з усімі суб’ектамі грамадзянскага супольніцтва. Фарміраванне новай якасці бібліятэкі як інструмента паступальнага развіцця соцыўма, дэмакратычнага здзяйснення эканамічных, прававых і адукацыйных рэформаў базіруецца на разуменні яе ролі ва ўзбагачэнні эканомікі ведаў, у павышэнні культурнага і інтэлектуальнага патэнцыялу грамадства і садзейнічанні яго бесперапыннай адукацыі, захаванні адзінства і стабільнасці.

На аснове адзначаных патэнцый бібліятэкі ў сучасным грамадстве найбольш значным паўстае раскрыццё яе ролі ў садзейнічанні гарманічнаму развіццю асобы на ўсіх этапах жыццядзейнасці, росту яе духоўнага патэнцыялу. У гэтай сувязі сучасная бібліятэчная навука і практыка акцэнтуюць увагу на сацыяльна-педагагічных аспектах бібліятэчнага абслугоўвання, у сувязі з чым у прафесійным друку актывізаваліся пытанні передолення стыхійнай сацыялізацыі асобы, стварэння ўмоў для яе самаразвіцця, самарэалізацыі, самаактуалізацыі і праяўлення здольнасцей, узвышэння маральных якасцей бібліятэчна-бібліяграфічнымі сродкамі.

Бібліятэка як інстытут сацыялізацыі (Н. В. Жадзько, Ю. П. Мяленцьева, В. А. Барадзіна, В. Р. Фірсаў) і інкультурацыі асобы (Н. Л. Голубева), цэнтр міжкультурнай камунікацыі (К. Ю. Геніева), суб’ект фарміравання «патрэбных» базавых каштоўнасцей грамадства (С. А. Басаў, Р. С. Матульскі) рэалізуе агульнасістэмную задачу грамадства па ўзнаўленні чалавечага патэнцыялу, таму мае непасрэднае дачыненне да праблемы фарміравання «культурнай асобы» згодна пануючым у сучаснай поліпарадыгмальнай педагагічнай рэальнасці прыярытэтам (А. В. Бандарэўская, В. Т. Кабуш, В. В. Серыкаў, В. Ф. Русецкі і інш.).

Замацаванне ролі бібліятэкі ў развіцці суб’екта культуры заснавана на інавацыйным падыходзе да разгляду чалавечага фактара ў бібліятэчнай сферы (С. Г. Матліна), на кульцівіраванні ў яе дзейнасці агульначалавечых каштоўнасцей (М. Я. Дворкіна, Л. А. Дзямешка, І. В. Лукашоў, Р. С. Матульскі, С. А. Паўлава, В. І. Харламаў і інш.), што ўзмацняе культуратворчую місію бібліятэкі, падкрэслівае сацыяльна-педагагічны складальнік яе дзейнасці. Зададзены вектар дэтэрмінуе скіраванасць бібліятэчнай практыкі на развіццё культурнай асобы, сацыяльна адэкватнай патрэбнасцям грамадства, і ўдакладняецца задачай фарміравання сацыяльна абумоўленых асабовых якасцей чытачоў, забяспечваючых пазітыўную сацыялізацыю, гарманізацыю стасункаў у соцыўме як мэты бібліятэчнага абслугоўвання на аснове антропацэнтрысцкай мадэлі развіцця асобы.

У пачатку XXI стагоддзя перад грамадствам стаіць задача па зацвярджэнні стаўлення да чалавека як да вышэйшай каштоўнасці, стварэнні ўмоў да гарманічнага развіцця асобы і росту яе духоўнага патэнцыялу [4, с. 8]. Адпавядаючы асноўным прыярытэтам развіцця беларускага грамадства, мэты, задачы, функцыі і кірункі дзейнасці бібліятэкі як сацыяльнага інстытута базіруюцца на вызначэнні агульначалавечых каштоўнасцей у якасці прыярытэтных [1], заснаваных на

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

сцвярджэнні чалавека як вышэйшай каштоўнасці, прызнанні яго права на ўсебаковае развіццё і праяўленне здольнасцей.

Зыходзячы з вызначэння гуманістычнага, сацыяльна-культурнага вектара бібліятэчнай стратэгіі як прыярытэтнага на сучасным этапе [3, с. 29], адным з кірункаў сацыяльна-педагагічнай дзейнасці бібліятэкі, накіраванай на стварэнне і рэалізацыю ўмоў для паўнавартаснага самаразвіцця, пазітыўнай сацыялізацыі і жыццёвага самавызначэння чалавека становіцца фарміраванне прававой культуры асобы як актуальнай інтэгратыўнай якасці, якая характарызуецца наяўнасцю і ступенню засваення прававых ведаў, маральна-прававых каштоўнасцей, установак і перакананняў як асновы правамерных паводзінаў, а таксама сацыяльна-прававой актыўнасцю.

Прававая культура займае асобае месца ў сістэме сацыяльных каардынат асобы і забяспечвае сацыяльна прымальныя паводзіны чалавека ў грамадстве. Фарміраванне актыўнага суб’екта прававой дзяржавы складае галоўны змест і кірунак выхавання падрастаючага пакалення, што з’яўляецца прыярытэтам нацыянальнай палітыкі і замацавана на высокім дзяржаўным узроўні. Так, Канцэпцыя бесперапыннай адукацыі дзяцей і навучэнскай моладзі ў Рэспубліцы Беларусь (2006) вызначае прававую культуру як сукупнасць прававых ведаў і здольнасць іх поўнай рэалізацыі ў розных відах дзейнасці, а таксама ставіць задачу па стварэнні ўмоў для фарміравання гуманістычна арыентаванай законапаслухмянай асобы, валодаючай грамадзянскімі пачуццямі і пачуццём уласнай годнасці, адаптаванай да ўмоў бягучага асяроддзя, умеючай адстойваць свае правы і не парушаць правы іншых [8].

У кантэксце адзначаных задач раскрыццё сацыяльна-педагагічных аспектаў дзейнасці бібліятэкі як сацыяльнага інстытута па фарміраванні прававой культуры падрастаючага пакалення набывае надзвычай актуальнае гучанне і патрабуе глыбокага тэарэтычнага асэнсавання з улікам адзначаных тэндэнцый бібліятэчнага абслугоўвання на сучасным этапе.

Неабходнасць увагі менавіта да падлеткавай аўдыторыі пацвярждаецца вынікамі псіхолага-педагагічных [7, 10, 13, 14] і юрыдыка-сацыялагічных даследаванняў [2, 5, 9, 15], навуковымі працамі па сацыяльнай філасофіі [11, 12], згодна якім падлеткавы ўзрост з’яўляецца найбольш прыдатным для фарміравання прававой культуры асобы. У бібліятэчнай сацыялогіі вызначана ўзроставая дыферэнцыяцыя чытацкіх груп [6, с. 21], заснаваная на асаблівасцях псіхафізічнага развіцця дзяцей і падлеткаў, максімальным уліку індывідуальных інтарэсаў, патрэбнасцей і чытацкіх інтарэсаў асобы, на узроўні культуры чытання і іншых параметрах, што дазваляе ажыццяўляць педагагічна карэктнае развіццё інфармацыйных, адукацыйных, дасугавых і іншых патрэбнасцей чытачоў. У адпаведнасці з гэтым менавіта дзяцей малодшага падлеткавага ўзросту (11–12 гадоў) мэтазгодна разглядаць як аб’ект бібліяпедагагічнага ўздзеяння з мэтай фарміравання прававой культуры як складанага асобаснага ўтварэння, на падставе таго, што адзначаны ўзрост з’яўляецца сензітыўным для прававой сацыялізацыі асобы.

Рэалізацыя патэнцыялу бібліятэкі па развіцці прававой культуры падлеткаў разглядаецца намі як неад’емны кірунак яе дзейнасці па фарміраванні маральнасці, грамадзянскасці, патрыятызму як базавых якасцей суб’екта прававой дзяржавы і грамадзянскага супольніцтва, значыць – фарміраванні сацыяльнай кампетэнтнасці асобы як умовы і паказчыка гарманізацыі стасункаў у соцыўме. З улікам сучасных трэндаў у вызначэнні прававой культуры асобы як яе інтэгратыўнай якасці, а таксама на аснове інтэграцыі існуючых падыходаў да працэсу яе фарміравання існуе патрэбнасць у комплексным даследаванні, накіраваным на раскрыццё магчымасцей бібліятэкі ў адзначаным кірунку.

Аналіз сацыялагічнай, юрыдычнай і педагагічнай літаратуры паказаў, што бібліятэка як сацыяльны інстытут пакуль што застаецца па-за полем бачання даследчыкаў праблем прававой культуры, нягледзячы на даволі актыўнае выка-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

рыстанне яе дыдактычных і выхаваўчых сродкаў у кірунку прававога развіцця асобы. У шэрагу крыніц ускосна закранаюцца магчымасці бібліятэкі ў працэсе прававога выхавання насельніцтва, раскрываюцца арганізацыйна-метадычныя пытанні праваасветніцкай дзейнасці, што сведчыць пра асэнсаванне бібліятэчнага патэнцыялу і выкарыстанне апошняга ў вырашэнні практычных пытанняў прававога выхавання асобы і грамадства ў цэлым.

Дзейнасць бібліятэкі будзе больш адпавядаць патрэбнасцям грамадства, калі яна будзе асэнсавана як спецыялізаваны інстытут фарміравання прававой культуры асобы і грамадства ў цэлым. Вырашэнне пастаўленай задачы звязана з абнаўленнем тэарэтыка-метадалагічных, арганізацыйна-тэхналагічных, змястоўна-прадметных параметраў яе дзейнасці па стварэнні бібліяпедагагічнага асяроддзя для прававога развіцця асобы на аснове асобасна арыентаванага і культуралагічнага падыходаў. Такім чынам, існуе аб’ектыўная патрэбнасць у новых навуковых падыходах, дазваляючых у поўнай ступені рэалізаваць працэс фарміравання прававой культуры асобы падлетка бібліятэчна-бібліяграфічнымі сродкамі публічнай бібліятэкі.

У заключэнне падкрэслім, што ў сістэме паняццяў гуманістычнага падыходу бібліятэчнае абслугоўванне садзейнічае развіццю асобы, здольнай да асэнсаванага светаўспрымання і пазітыўнай сацыяльнай адаптацыі ў соцыўме. У новым парадыгмальным кантэксце мадэль фарміравання прававой культуры асобы ў бібліятэчным асяроддзі выступае як асобасна-арыентаваная з яе гуманістычнай чалавекаразмернасцю і культуратворчай скіраванасцю. Адпаведна пераасэнсаванаму разуменню бібліятэчнага абслугоўвання, якое трактуецца як сродак станаўлення асобы, яе самаразвіцця і самаўдасканалення, садзейнічання працэсу раскрыцця яе патэнцыялу, дзейнасць бібліятэкі па стварэнні ўмоў для развіцця правакультурнай асобы набывае высокую сацыяльную значнасць і характарызуе заканамерную эвалюцыю бібліятэкі як самаарганізуючайся сістэмы ў новых сацыяполікультурных умовах.

***Літаратура***

1. Аб бібліятэчнай справе ў Рэспубліцы Беларусь: Закон Рэспублікі Беларусь ад 22 сакавіка 1995 г. № 3680-XII (у рэдакцыі Закона Рэспублікі Беаларусь ад 31.12.2009 № 114-З) // Национальный реестр правовых актов Республики Беларусь. – 2010. – № 15. – ст. 2/1666.

2. Арутюнян, М. Ю. Образ и опыт права: Правовая социализация в изменяющейся России / М. Ю. Арутюнян, О. М. Здавомыслова, Ш. Курильски-Ожвэн. – М.: Весь мир, 2008. – 208 с.

3. Басов, С. А. Библиотека в контексте цивилизации и культуры / С. А. Басов // Библиотековедение. – 2010. – № 1. – С. 25–32.

4. Голубева, Н. Л. Пространство сближения. Библиотека как институт инкультурации нового поколения / Н. Л. Голубева // Библиотечное дело. – 2010. – № 12. – С. 8–11.

5. Зубок, Ю. А. О формировании правовой культуры молодежи в России и Беларуси // СОЦИС. – 2006. – № 10. – С. 70–71.

6. Дзямешка, Л. А. Дзейнасць бібліятэкі як сацыяльнай установы / Л. А. Дзямешка, С. А. Паўлава // Сацыяльна-педагагічная работа. – 2008. – № 8. – С. 20–24. (с. 21)

7. Иманкуилов, Р. И. Психолого-педагогические аспекты правового сознания (Школьный возраст): автореф. дис. …канд. психол. наук: 19.00.07 / Р. И. Иманкуилов; Кубанск. гос. ун-т. – Краснодар, 1998. – 17 с.

8. Концепция непрерывного воспитания детей и учащейся молодежи: постановление Министерства образования Республики Беларусь, 14 дек. 2006 г., № 125: сб-к нормат. док. / Нац. ин-т образования; редкол.: Б. В. Иванов [и др.]. – Минск, 2007. – С. 9–40.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

9. Каландришвили, З. Н. Правовая социализация как условие преодоления деформации правового сознания молодежи / З. Н. Каландришвили // Ленинградский юридический журнал. – 2008. – № 1 (11). – С. 106–120.

10. Міронава, С. У. Аб прававой культуры вучняў падлеткавага ўзросту / С. У. Міронава // Адукацыя і выхаванне. – 2004. – № 11. – С. 9–12.

11. Моджина, Н. В. Право как ценность и его роль в воспитании личности: автореф. дис …канд. филос. наук: 09.00.11 / Н. В. Моджина. – Уфа, 2006. – 20 с.

12. Муслумова, Т. В. Правовая культура детей: социально-философский анализ: монография / Т. В. Муслумова. – Уфа: БашГУ, 2003.– 294 с.

13. Царик, И. А. Нравственно-правовое воспитание подростков / И. А. Царик, А. В. Торохова, Н. Ю. Клышевич. – Минск: НИО, 2000. – 120 с.

14. Элиасберг, Н. И. Система этико-правового образования школьников. Петербургская модель / Н. И. Элиасберг // Российская конференция информационно-правовых центров для детей и подростков «Петербургская модель этико-правового образования школьников» (25–27 ноября 2002 г., г. Санкт-Петербург) / сост.: В. К. Кузнецова, Ю. В. Ершова. – СПб.: ЦДГБ, 2003. – С. 24–29.

15. Kourilsky-Augeven Ch. Et al. Les 11-17 ans face au Droit en France et en Pologne. Une enquete comparative de socialization juridique // Revue d'Etudes Comparatives Est-Ouest. – 1990. – Vol. 21. – № 3.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ